# Рэцэнзіі

У.ф. Ладысеў. **Беларуская нацыя: уз'яднанне. Верасень 1939 г. - чэрвень 1941 г.: 36. дакументаў і матэрыялаў. Мн.:** БДУ, 2004. 199 с.

Першая частка гэтага зборніка мае назву "Адзінства, выпрабаванае часам і жыццём". Яна з'яўляецца фактычна ўступным артыкулам, дзе выкладзены каментарый падзей, што адбываліся ў заходняй частцы Беларусі ў 1939-1941 гг. Другая частка кнігі, якая змяшчае 132 дакументальныя матэрыялы, самая аб'ёмная і змястоўная. Большая частка апублікаваных крыніц упершыню ўведзена ў навуковы зварот - гэта дакументы з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці, а таксама Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва, Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі. Для зручнасці карыстання ўсе крыніцы згрупаваны ў чатыры тэматычныя блокі: 1) дакументы аб савецка-польска-германскіх адносінах напярэдадні Другой сусветнай вайны і савецка-польскай ваеннай кампаніі; 2) дакументы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР, выбарчай кампаніі ў Народны сход і яго рашэннях; 3) "саветызацыя" краю: матэрыялы аб характары сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў; 4) дакументальныя сведчанні аб мерапрыемствах ідэалагічнага характеру, дэпартацыях і антысавецкіх выступленнях. Для чытачоў варта было б падаць імянны паказальнік у каментарыях да асобных дакументаў.

Па вузлавых момантах заходнебеларускай праблематыкі прафесар У.Ф. Ладысеў уступіў у сур'ёзную навуковую палеміку з польскімі даследчыкамі. У польскай гістарычнай навуцы тэрыторыя былой Заходняй Беларусі нярэдка называецца "паўночна-ўсходнімі ўскраінамі И Польскай рэспублікі". Як слушна адзначыў аўтар-укладальнік, тым самым адмаўлялася "гістарычнае права беларускага народа на самавызначэнне, маладасведчанаму чытачу прыводзяцца даныя польскага перапісу 1921 г. аб нацыянальным складзе насельніцтва заходняга рэгіёна Беларусі, у якіх наўмысна зменшана колькасць беларускага насельніцтва і штучна завышана польскага ў мэтах доказу правамернасці анексіі беларускіх зямель" (с. 7). У дадзенай працы крытычна аналізуюцца розныя гістарычныя крыніцы, узважліва ацэньваецца пазіцыя розных навукоўцаў. Праўда, аўтар не падае лічбаў уласных падлікаў, хаця ў іншым выданні колькасць беларускага насельніцтва ён вызначыў прыкладна ў 2 млн чалавек (без уліку каля 500 тыс. бежанцаў, што вярнуліся на радзіму да сярэдзіны 1924 г.) (Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917-1939 гг.). Мн.: БДУ, 2003. С. 164). Не навуковым, а палітызаваным назваў У.Ф. Ладысеў сцвярджэнне польскага гісторыка Т. Стжэмбаша аб тым, што Заходняя Беларусь была штучным утварэннем, якое ніяк не залежала ад этнічнага складу насельніцтва, нацыянальных, дзяржаўных традыцый, волі людзей, геаграфічнага фактару. Паводле У.Ф. Ладысева, паняцце "Заходняя Беларусь" афармілася яшчэ ў пачатку 1920-х гг., а беларуская дзяржаўнасць мела да таго часу свае багатыя гістарычныя, прававыя, нацыянальныя традыцыі, акрэсленыя межы. Уяўляецца правільным падыход, якога прытрымліваюцца сучасныя беларускія даследчыкі - разглядаць вераснёўскія падзеі 1939 г. у кантэксце геапалітычных змен, што адбыліся пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавору 1921 г., а таксама ў сукупнасці з сацыяльна-эканамічным, палітычным, нацыянальна-культурным становішчам заходнебеларускіх зямель у складзе Польскай дзяржавы ў 1921-1939 гг. Адзначым, што І паняцце "Другая Рэч Паспалітая", якое прысутнічае ў польскім навуковым друку, а апошнім часам сустракаецца і ў асобных працах беларускіх гісторыкаў, з'яўляецца не столькі навуковым, колькі палітызаваным, бо не адлюстроўвае сутнасці міжваеннай Польшчы, якая была на самай справе унітарнай дзяржавай.

На падставе апублікаваных дакументаў, архіўных матэрыялаў аўтар рэцэнзуемага выдання паспрабаваў разабрацца ў заблытаным клубку актыўнай дыпламатычнай барацьбы ў жніўні 1939 г. У дадзенай кнізе шмат увагі нададзена вераснёўскай ваеннай кампаніі 1939 г. У.Ф. Ладысеў пагаджаецца з польскім вучоным М. Гнатоўскім у тым, што сапраўды беларуская савецкая гістарыяграфія не асвятляла аб'ектыўна ўваход Чырво-

най Арміі ў Заходнюю Беларусь, празмерна ідэалагізавала "вызваленчы паход". Слушна адзначана, што на працягу многіх дзесяцігоддзяў айчынныя даследчыкі былі пазбаўлены магчымасці грунтоўнага аналізу крыніц, значная частка якіх была недаступнай для вывучэння. Аднак пры гэтым ён перасцерагае польскіх калег ад паўтарэння памылак мінулага. На думку У.Ф. Ладысева, адкідваючы ранейшы адназначны, схематычны падыход пра падзеі верасня 1939 г., нельга прыняць цяперашні спрошчаны тэзіс польскіх і замежных гісторыкаў аб "савецкай агрэсіі". Найперш ваенна-палітычныя абставіны прымусілі сталінскае кіраўніцтва аддаць загад аб паходзе. "Аб'ектыўна дзеянні савецкіх войскаў паглыбілі трагічную сітуацыю ў Польшчы, - адзначае аўтар, - адмоўна адбіліся на маральна-псіхалагічным стане польскіх салдат і афіцэраў" (с. 12). Прыведзеныя даклады, справаздачы, загады, пастановы дазваляюць скласці падрабязную храналогію ваенных дзеянняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, высветліць першую рэакцыю мясцовага насельніцтва на прыход чырвонаармейцаў.

Абапіраючыся на архіўныя крыніцы, У.Ф. Ладысеў прааналізаваў складаны працэс устанаўлення Савецкай улады, ход яе мерапрыемстваў у галіне эканомікі, сацыяльнай сферы, грамадскім і культурным жыцці заходніх абласцей БССР да чэрвеня 1941 г. Пры гэтым прагледжваецца яго імкненне да ўсебаковага, пазбаўленага тэндэнцыйнасці, аналізу падзей, асоб. Некаторыя стэрэатыпы, што замацаваны ў працах айчынных навукоўцаў, у рэцэнзуемым выданні пастаўлены пад сумненне. Напрыклад, на старонках навуковай і вучэбнай літаратуры сцвярджаецца, што 5 кастрычніка 1939 г. часовая ўправа Беластока звярнулася да ўсіх часовых упраў краю з прапановай склікаць Народны сход для вырашэння асноўных пытанняў дзяржаўнага ладу (Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1995. 4.2. С. 256 і інш.). На падставе змешчаных у зборніку дакументаў даказваецца, што ўпершыню аб падрыхтоўцы да склікання Народнага сходу Заходняй Беларусі заяўлялася ў пастанове № 1 Ваеннага савета Беларускага фронту напярэдадні наступлення 16 верасня 1939 г., а больш падрабязна - у пастанове Палітбюро ЦК УКП(б) у Маскве 1 кастрычніка таго ж года. У кнізе закрануты не толькі стваральныя моманты таго часу. Культ асобы Сталіна, атмасфера падазронасці, татальнага недаверу адмоўна паўплывалі на грамадска-палітычнае жыццё краю. Пра гэта сведчаць драматычныя падзеі - масавыя арышты, дэпартацыі насельніцтва. Надрукаваныя ў зборніку дакументы раскрываюць мэты, змест, маштабы дэпартацый. Пры вызначэнні колькасці выселеных з Заходняй Беларусі ў Сібір, Казахстан і іншыя месцы да 20 чэрвеня 1941 г. аўтар-укладальнік прытрымліваецца пазіцыі айчыннага даследчыка А. Хацкевіча (120-125 тыс. чал.). Падкрэсліваецца, што "...дакументаў, якія б пацвярджалі лічбу 1 млн. ці 1,5 млн. чалавек, што называюць асобныя польскія аўтары, не выяўлена" (с. 27).

Апублікаваныя матэрыялы, нягледзячы на іх афіцыйны характар, дазваляюць часткова адчуць праблемы "малога чалавека", яго побыт. Цікавасць уяўляюць дакументы аб матэрыяльным становішчы бежанцаў, сялян, рабочых, інтэлігенцыі, стане спажывецкага рынку, стварэнні першых калгасаў і інш. Яны могуць быць істотным дапаўненнем да ўспамінаў і іншых крыніц. На думку аўтара-складальніка кнігі, уз'яднанне беларускай нацыі мела ўсё-такі вялікае гістарычнае і палітычнае значэнне, бо беларускі этнас атрымаў магчымасць разам жыць, працаваць, сумесна адстойваць свае інтарэсы.

Варта адзначыць, што рэцэнзуемы твор можа выкарыстоўвацца не толькі для самастойнай працы студэнтаў, вучняў, але і для настаўнікаў сярэдніх школ, аспірантаў, выкладчыкаў ВНУ. Зборнік трэба разглядаць як вучэбнае і навуковае выданне, дзе зроблены сур'ёзны крок у напрамку пашырэння крыніцазнаўчай базы гістарычных даследаванняў.

***А.М. Вабішчэвіч,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі культуры і рэлігіі
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта
імя А.С. Пушкіна

**В.А.** Божанов. **Восхождение к абсолютной власти: большевики и советское государство в 20-е годы. Мн.:** Тесей, 2004.

Механизм подчинения большевистской партии государственного аппарата, создание тоталитарной системы в стране не получили комплексного, цельного научного освещения в советской и постсоветской историографии. Название рецензируемой книги и ее содержание свидетельствуют, что большевики всегда стремились сделать власть для себя необъятной, абсолютной, несменяемой, причем во всех сферах жизни - от политической до личной.

Система аргументов и доказательств в книге базируется на всестороннем анализе партийных и государственных документов, реальных жизненных ситуаций и убедительно говорит о том, что власть для большевиков всегда являлась центральным мотивом их деятельности.

Вопреки советам В.И. Ленина перейти от борьбы за власть к "культурной" работе на XII съезде РКП(б) (1923 г.) был поставлен вопрос о превращении диктатуры пролетариата в диктатуру партии и прямо говорилось о приоритете политики (т. е. власти) над хозяйствованием (политический доклад Г. Зиновьева, речь Н. Преображенского и др.). Во время НЭПа жизнь людей стала заметно изменяться к лучшему. Но многоукладная экономика вызывала необходимость многоукладности и в политике. Именно боязнь потерять власть привела большевиков к мысли ликвидировать НЭП, что к концу 1920-х гг. и было сделано.

Борьба за власть более чем через десять лет после октября 1917 г. оставалась главной